УДК 7.071.1:[75+76]:7.04(476.5-25)

# Паэтыка і семантыка мастацкіх вобразаў у жывапісе і графіцы Алеся Мемуса

*Цыбульскі М.Л.*
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск*

*У артыкуле ў кантэксце агульных праблем паэтыкі і семантыкі разглядаюцца асноўныя асаблівасці мастацкіх вобразаў у творах вядомага беларускага графіка і жывапісца Алеся Мемуса. Унікальнасць і непаўторнасць яго аўтарскай манеры паўстае ў гарманічным спалучэнні філасофска-рамантычнага мыслення творцы з высокаякаснай тэхнікай малюнка і вытанчанай каларыстычнай інтэрпрэтацыяй рэчаіснасці. Многія вобразы ў творах мастака не толькі філасафічныя, але і сімвалічныя.*

*Алесь Мемус працуе ў межах уласнай семіятычнай сістэмы, што і дазваляе яму па-рознаму і заўжды падкрэслена па-аўтарску ўвасабляць тую ці іншую тэму. Для гэтага мастака прэстыж знака відавочны, і кожная рэальная выява ў яго творах патэнцыяльная, нібыта з'арыентавана на ператварэнне ў знак. Вобразы ў кампазіцыях Мемуса – гэта заўсёды нейкая сгарманізаваная цэласнасць формы і зместу, магчыма, не да канца артыкуляванага і вызначанага, але заўжды падкрэслена індывідуальнага, эфектнага і выразнага.*

*Семантычныя сувязі паміж элементамі карціны ў Мемуса фарміруюцца і з дапамогай дынамізму кампазіцыйнай пабудовы, рытму, які адыгрывае вялікую ролю ў яго графіцы і жывапісе. Эстэтызацыя адлюстраваных аб'ектаў і рамантызацыя прыгажосці – яскравыя прыкметы графічных і жывапісных твораў Алеся Мемуса, якія надаюць ім вельмі прыцягальны характар.*

*У даследаванні аўтар аналізуе творы мастака, што былі выкананы ў розных графічных тэхніках – акварэлі, гуашы і алейным жывапісе – на працягу ўсёй творчасці. Разглядаюцца найбольш папулярныя тэмы, жанры і вобразы, што вызначаюць адметны характар творчай манеры Алеся Мемуса.*

***Ключавыя словы:*** *Алесь Мемус, жывапіс і графіка XX–XXI стст., паэтыка, семантыка, мастацкі вобраз, малюнак, акварэль, гуаш, пастэль, алейны жывапіс.*

*(Искусство и культура. – 2024. – № 3(55). – С. 12–16)*

# Poetics and Semantics of Artistic Images in the Painting and Graphics of Ales Memus

*Tsybulsky M.L.*
*Educational institution "Vitebsk State University named after P.M. Masherov", Vitebsk*

*In the context of general problems of poetics and semantics, the article examines the main features of artistic images in the works of the famous Belarusian graphic artist and painter Ales Memus. The uniqueness and inimitability of his author's manner arises from the harmonious combination of the creator's philosophical and romantic thinking with high-quality drawing techniques and sophisticated coloristic interpretation of reality. Many images in the artist's works are not only philosophical but also symbolic.*

*Ales Memus works within the limits of his own semiotic system, which allows him to embody this or that theme in a different and always emphatically authorial way.*

*For this artist, the prestige of the sign is obvious, and every real image in his works is potentially, as it were, oriented towards becoming a sign. The images in Memus's compositions are always a kind of harmonized unity of form and content, perhaps not fully articulated and defined, but always emphasized individual, effective and expressive.*

*Semantic connections between the elements of the picture in Memus are formed with the help of the dynamism of the compositional structure, rhythm, which plays a big role in his graphics and painting. Aesthetization of depicted objects and romanticization of beauty are prominent features of Ales Memus' graphic and painting works, which give them a very attractive character.*

*In the article, the author analyzes the works of the artist, which were made in various graphic techniques, watercolor, gouache and oil painting throughout the entire career of Ales Memus. The most popular themes, genres and images that determine the distinctive nature of the artist's creative manner are considered.*

***Key words:*** *Ales Memus, painting and graphics of the 20th–21st centuries, poetics, semantics, artistic image, drawing, watercolor, gouache, pastel, oil painting.*

*(Art and Cultur. – 2024. – № 3(55). – P. 12–16)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: mtsybulsky@rambler.ru – М.Л. Цыбульскі*

Творчасць А. Мемуса дастаткова добра вядома даследчыкам беларускага мастацтва XX–XXI ст., яго асноўныя творы сёння знаходзяцца ў мастацкіх музеях нашай краіны. Безумоўна, сярод аналітыкаў яго творчасці вядомыя беларускія мастацтвазнаўцы, якія у сваіх публікацыях паспрабавалі дакрануцца да вызначэння адметнасцей індывідуальнай манеры А. Мемуса. І тым не менш нельга ўпэўнена сцвярджаць, што глыбінныя пласты вобразнай прасторы яго графічных і жывапісных твораў грунтоўна прааналізаваны. Даследаванне розных аспектаў паэтыкі і семантыкі ў творах гэтага мастака мае важнае значэнне, дазваляе наблізіцца да асэнсавання і спасціжэння сутнасці вобразаў, якія ён стварае. Безумоўна, кожнае такое набліжэнне ўсяго толькі інтэрпрэтацыя аўтарскіх сэнсаў, якая раскрывае для нас адметныя асаблівасці яго аўтарскага светапогляду.

Мэта артыкула – прааналізаваць асноўныя асаблівасці паэтыкі і семантыкі мастацкіх вобразаў у жывапісе і графіцы Алеся Мемуса.

**Пазіцыя ў мастацтве.** У фарміраванні А. Мемуса, гэтага арыгінальнага творцы, важную ролю адыграла нацыянальная самасвядомасць. Яшчэ ў час вучобы ў Акадэміі мастацтваў у Ленінградзе Алесь Мемус захапіўся нечакана для сябе беларускасцю. “На вольны летні пленэр упершыню паехаў на Радзіму ў Беларусь. Тут нанова нарадзілася мая душа, тут яна набыла крылы…”[1] Менавіта зварот да сваіх вытокаў, да ведаў па гісторыі, культуры беларускага народа з цягам часу ператварылі мастака ў носьбіта гэтых традыцый. Сапраўды, “Алесь Мемус – эталон мастака-інтэлігента, здольнага насіць у сабе культуру мінулага, знайсці тонкія ніткі памяці аб мінулым, арганічна звязаць іх з сучаснасцю” [1].

У каталозе адной з першых сваіх персанальных выстаў А. Мемус адзначаў: “Мой вышэйшы натхняльнік – неабсяжны свет прыродных формаў і рытмаў (...) Усё існае перапоўнена таемным жыццём, дзе Боская радасць мяжуе з дыханнем смерці...” [2]. Аднак высока ацэньваючы Боскую прыгажосць зямнога свету мастак, між тым, зусім не схільны быў адназначна пераносіць яе ў свае творы. Кампазіцыі А. Мемуса – гэта своеасаблівыя праекцыі матэрыяльных рэаліяў у вобразнай прасторы, “пабудаванай“ светаўспрыняццем творцы.

Унікальнасць і непаўторнасць яго аўтарскай манеры паўстае ў гарманічным спалучэнні філасофска-рамантычнага мыслення творцы з высокаякаснай тэхнікай малюнка і вытанчанай каларыстычнай інтэрпрэтацыяй рэчаіснасці. Многія вобразы ў творах мастака не толькі філасафічныя, але і сімвалічны. Прытым шматслаёвая сэнсавая структура падобных знакавых формаў накіравана на тое, каб пагрузіць кожную аб’ект/з’яву ў прастору паэтычных і рамантычных сэнсаў.

Мадэлі для А. Мемуса, як і іншыя аб’екты адлюстравання, – гэта заўжды ўвасабленне прыгажосці, гармоніі, кахання. Разам з тым мастака хвалююць “вечныя” праблемы. У многіх сваіх творах ён нібы разважае аб жыцці, смерці і вечнасці... Ёсць і вобразы-канстанты (адным з якіх, напрыклад, з’яўляецца кветка), што прадстаўлены ў розных сэнсавых канатацыях.

Алесь Мемус працуе ў межах уласнай семіятычнай сістэмы, што і дазваляе яму па-рознаму і заўжды падкрэслена ўвасабляць тую ці іншую тэму. Для гэтага мастака прэстыж знака відавочны, і кожная рэальная выява ў яго творах патэнцыяльна з’арыентавана на пераўвасабленне ў знак. Рух ад вобраза да знака, асабліва ўласцівы мове сучаснага, постмадэрнісцкага мастацтва, раскрывае дынаміку развіцця вобразнага сэнсу ў большасці кампазіцый гэтага майстра. Спецыфічныя трансфармацыі часу і прасторы – неад’емная рыса большасці твораў А. Мемуса.

Для мастака важны не толькі аб’ект адлюстравання, але і яго аўра. Даволі часта ён выкарыстоўвае ў сваіх творах адны і тыя ж прадметы, але пры тым імкнецца да іх разнастайнай семантычнай інтэрпрэтацыі. Дзякуючы розным кампазіцыйным інварыянтам, вобразным кантэкстам А. Мемус узмацняе гучанне ў нечым сімвалічных і архетыпічных выяў, імкнецца да іх амбівалентнасці.

Вобразы ў кампазіцыях Мемуса – гэта заўсёды нейкая сгарманізаваная цэласнасць формы і зместу, магчыма, не да канца артыкуляванага і вызначанага, але заўжды падкрэслена індывідуальнага, эфектнага і выразнага. Вялікую ролю ў перадачы зместу і арганізацыі сэнсаў адыгрывае ўнутраная драматургія вобразнага поля. Усе сродкі мастацкай выразнасці ў яго творах – каларыт, рытм і пластыка – працуюць на вобраз. Асобныя элементы кампазіцыі натуральна і арганічна дзіўным чынам пераплятаюцца. Лёгкасць і віртуознасць у лінейнай і пластычнай інтэрпрэтацыі формы ўдала спалучаюцца з высакароднай вытанчанасцю каларыстычнага рашэння. Асаблівая роля ў кожнай кампазіцыі мастака належыць дэталі, яе форме, пластыцы, яе культурнаму кантэксту. Безумоўна, “ключы ад вобраза” схаваны і ў эмацыянальна выразнай назве карціны.

Семантычныя сувязі паміж элементамі карціны ў Мемуса фарміруюцца і з дапамогай дынамізму кампазіцыйнай пабудовы, рытму, які адыгрывае вялікую ролю ў яго графіцы і жывапісе. Магчыма яго роля не заўсёды адразу прасочваецца, але менавіта рытм хутка

[1] З інтэрв’ю.

настройвае гледача на адпаведны лад. У творах А. Мемуса рытм перададзены то геаметрыяй і архітэктонікай формаў, то пpастоpавымі суадносінамі, то святлом. Уласцівыя большасці жывапісных твораў мастака “халодны арыстакратызм фарбаў”, каларыстычная стрыманасць і сапраўдная феерыя паўтаноў вылучаюць А. Мемуса сярод многіх віцебскіх творцаў.

Алесь Мемус заўжды імкнуўся да пошуку арыгінальных рашэнняў, шмат эксперыментаваў, змяняючы пастаўленыя перад сабой творчыя задачы... Як сэнсавыя, так і кампазіцыйна-пластычныя, жывапісныя. Сярод першых, напрыклад, падмена “логікі” пабудовы вобраза парадоксамі. Мастака на розных этапах творчасці хвалявалі і больш канкрэтныя, чыста тэхналагічныя праблемы, накіраваныя на пераадоленне супраціву матэрыялу, якія вядомы ўсім мастакам. Супраціў матэрыялу, што надае працэсу творчасці асаблівую энергетыку, у якой, на погляд А. Мемуса, “вышэйшая “радасць” мастака. Пры гэтым Алесь Мемус цудоўна разумее, што “ў мастацтве многае немагчыма дасягнуць зьнянацку. Можна толькі дапаўзьці праз уласны вопыт”.[2]

Эстэтызацыя аб’ектаў і рамантызацыя прыгажосці – яскравыя прыкметы яго графічных і жывапісных твораў, якія надаюць вельмі прыцягальны характар работам. Відавочна мае рацыю Л.У. Вакар, калі адзначае КРАСУ як “сутнасць мастакоўскага аповяду Алеся Мемуса. Што б ён не маляваў: краявід, партрэт, нацюрморт – паўсюдна гледача сустрэне знак прыгажосці” [3, с. 3–4]. У Мемуса краса не проста аб’ект абагаўлення. Яна арганічная частка вобразнага ладу ўсіх твораў мастака. Відавочна, што ў гэтым вызначальнай уяўляецца роля густу мастака, які насуперак прынятаму меркаванню, не толькі не перашкаджае элегантнай праяве яго індывідуальнасці, але раскрывае надзвычай высокі ўзровень развіцця яго асобы, яго інтэлект, энергію.

Ці не на ўсіх этапах творчасці А. Мемуса на яго ўплывала і паэзія. У пэўны час розныя аўтары, але заўжды тыя, якія “клаліся яму на мелодыю душы”: Бадлер і Рэмбо Хафіз і Апалінэр, Бродскі і Верхарн, Рыльке і Багдановіч і многія, многія іншыя.

Высакародная, шляхетная і свабодалюбівая натура Алеся Мемуса катэгарычна ніколі не прымала шэрасці і аднатыпнасці мыслення ў мастацтве. Творца здаецца заўжды імкнуўся насуперак усяму жыць стыхійна ў гэтым свеце. Яго з дзяцінства асабліва захаплялі лёс вольнага мастака і жыццё непазбаўленае пакут, але асвечанае боскай тайнай светаўладкавання. Бунтарскі дух стаў відавочнай прыкметай яго творчага і педагагічнага іміджу... Яго хранічная (па словах самога мастака) аддаленасць ад Саюза мастакоў на працягу доўгага часу была свайго роду пратэстам. А. Мемус заўсёды імкнуўся быць незалежным ад пасад, званняў, саюзаў, суполак... Займаўся любімай справай і аддаваўся ёй цалкам[3].

Разам з тым А. Мемус хоць і аддаваў сябе ў поўнай меры мастацтву выяўленчаму, не менш прафесійна і апантана займаўся айчыннай гісторыяй і археалогіяй, мастацкай фатаграфіяй і калекцыяніраваннем старажытнасцей, краязнаўствам і мастацтвазнаўствам. Выдатныя фотаздымкі помнікаў беларускай архітэктуры, зробленыя А. Мемусам, неаднойчы друкавалі розныя беларускія перыядычныя выданні.

**Графіка.** Нягледзячы на творчую шматграннасць, працу ў розных тэхніках, Алесь Мемус заўжды лічыў сябе выключна графікам. І прычына была не толькі ў тым, што мастак скончыў графічны факультэт у Інстытуце жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Іллі Рэпіна Акадэміі мастацтваў СССР (Ленінград, 1974), дзе ў якасці дыпломнай работы стварыў афармленне і ілюстрацыі да паэмы Я. Коласа “Сымон-музыка”. Выдатная адзнака за гэту кваліфікацыйную работу была хутчэй сведчаннем шчырага і моцнага захаплення А. Мемусам беларускасцю і працай графічнымі матэрыяламі.

Мастак працуе ў розных графічных тэхніках (малюнак алоўкам, туш, пяро, вугаль, сангіна, фламастар, пастэль, змешаная тэхніка), але доўгі час лічыў менавіта жывы малюнак ці не асноўным кірункам сваёй творчасці. На графічных аркушах А. Мемуса “пануе вострахарактарная, рухомая, зграбная лінія, якая з’яўляецца той дамінантай, на якой трымаецца вобразны лад твораў” [4, с. 78]. У яе далікатнасці і вытанчанасці, звілістасці і плаўнасці, рытмічнай экспрэсіўнасці і эмацыянальнай насычанасці яскрава праяўляецца характар мастака.

Першая персанальная выстава “20 малюнкаў А. Мемуса” адкрылася ў Віцебску ў магазіне “Мастацтва” 1 верасня 1986 года. Ужо ў той час былі відавочныя жанравыя прыхільнасці мастака, цэнтральнае месца сярод якіх займалі партрэт, нацюрморт і пейзаж.

Графічны партрэт – адно з першых і моцных захапленняў А. Мемуса. У Віцебску ён малюе студэнтаў, калег – выкладчыкаў мастацка-графічнага, натуршчыц... Мастак шукае незвычайныя ракурсы, працуе над дынамікай. У яго партрэтах “характар кожнага персанажа нараджаецца разам з настроем майстра ў пэўны момант” [2]. Пазней шмат партрэтаў перыяду 1976–1996 гг. мастак аб’яднае ў адну серыю “Пялёсткі”...

[2] З інтэрв’ю.

[3] З інтэрв’ю.

Піша А. Мемус і партрэты блізкіх яму людзей, а прыязджаючы да бацькоў у Рагачоў вечарамі малюе сваю нястомную мадэль маці. Але часцей за ўсё, безумоўна, звяртаецца да партрэтаў (у розных тэхніках) сваёй жонкі Ірыны Магучай. Ці не самы экстравагантны з іх навагрудскі партрэт Ірыны, які выкананы чорным алоўкам і… чырвоным вінoм! Гэта "Рамантычны партрэт" (1991).

Партрэт, як і іншыя творы А. Мемуса, не пазбаўлены рыс стылістыкі мадэрну. Гэта відавочна і ў агульных прынцыпах формаўтварэння і ў своеасаблівай іканаграфічнай інтэрпрэтацыі вобразаў. У пабудове агульнай кампазіцыі, з асаблівай прыхільнасцю да хвалепадобных ліній, да дэкаратыўнай выразнасці кожнай дэталі. І пры тым у кожным вобразе за знешняй эфектнасцю мы бачым характар, індывідуальнасць, асобу...

Жаночыя вобразы асабліва частыя ў графічных творах А. Мемуса. Дзяўчаты на яго малюнках вытанчаныя і грацыёзныя. Мастак ловіць іх мімалётную прыгажосць – прыгажосць погляду, паставы, рухі, іх непасрэднасць і непаўторнасць. Асобная група твораў – аўтапартрэты мастака, якія былі выкананы ў розныя гады. Кожны з іх, а іх больш дзясятка, адметны пэўнай эмацыянальнай і псіхалагічнай танальнасцю.

Не менш папулярны, чым партрэт, у графіцы А. Мемуса матыў кветак, а летам яшчэ і траў. З захапленнем ён маляваў алоўкам і пастэллю рагачоўскія чорныя мальвы і сонечнікі, лужаснянскія званочкі... Падкрэсліваў, што лепей за ўсё маляваць бліжэй да вечара, калі ў змроку пасяляецца ў травах і тайна, і казка[4]. Ужо ў пачатку 1980-х з'яўляюцца ў творчасці мастака і кампазіцыі з сухімі кветкамі ("Нацюрморт з сухімі гвазьдзікамі" (1982, аловак). Пазней ён стане адным з цэнтральных і ў графіцы, і ў жывапісе. Сярод краявідаў замалёўкі, якія мастак ствараў у час шматлікіх вандровак па беларускіх гарадах і мястэчках, зачараваны тамтэйшымі помнікамі (ці іх рэшткамі) старажытнай архітэктуры.

Этапнымі для прэзентацыі графічнай творчасці мастака сталі дзве персанальныя выставы, што адбыліся ў 1990 годзе: "Сто малюнкаў Аляксандра Мемуса" ў Цэнтры Марка Шагала (Віцебск) і "Выбраныя малюнкі" ў Доме работнікаў мастацтва (Мінск). У пачатку 90-х мастацтвазнаўца М. Паграноўскі адзначае: "А. Мемус – сапраўдны майстар малюнка. (...) Для яго малюнак – гэта паслухмяны інструмент мастацкага мыслення і творчасці" [5, с. 38–39]. А ў 1993 г. часопіс "Маладосць" публікуе пра творчасць мастака развагі Я. Шунейкі [6, с. 96–97], а ў якасці ілюстрацый прадстаўляе пастэлі апошніх гадоў. Пастэль мастак выкарыстоўвае то самастойна, то разам з іншымі графічнымі матэрыяламі.

[4] З інтэрв'ю.

У 2002 годзе мастак задумвае і пачынае даволі фарматную серыю "Гатычныя рэмінісцэнцыі" (2003–2010) спачатку на 24 аркушы; пазней скарачае яе да 14. У серыю ўвайшлі такія творы, як "Вадалей", "Давід", "Кароль", "Міфалогія", "Нірвана" і іншыя. Менавіта трыма аркушамі з гэтай серыі мастак прыняў удзел ў Другім біенале графікі ў Пецярбургу (2003).

**Акварэльныя нацюрморты.** Ужо ў сярэдзіне 1980-х мастак звяртаецца да акварэлі, але ўсур'ёз, на яго думку, пачынае займацца ёю толькі з 1989 года. Ужо на выставах акварэлістаў у пачатку 1990-х, дзе А. Мемус паказаў уласныя акварэлі, яго прызнаюць сапраўдным карыфеем і майстрам гэтай тэхнікі.

Акварэлі А. Мемуса – гэта вытанчаны крохкі свет філасафічных і шмат у чым загадкавых вобразаў, якія пранізаны сімваламі. Ствараючы нібыта ірэальную прастору ў сваіх акварэльных аркушах, мастак асаблівую ўвагу надае фону, які становіцца істотным кампанентам вобразнай характарыстыкі.

Вызначыць жанравую прыналежнасць яго акварэльных твораў не заўжды магчыма. Большасць яго кампазіцый, якія фармальна адносяць да нацюрмортаў, такімі не з'яўляюцца. Гэта хутчэй тэматычныя кампазіцыі, а часам, дакладней будзе сказаць, што гэта партрэты рэчаў, "сімвалы ўспрымання мастаком часу, які не шкадуе ні чалавека, ні дарагіх яму ўспамінаў" [7, с. 12]. Даволі часта ў цэнтры ўвагі гістарычныя артэфакты, якія не пазбаўлены асацыяцый, сімвалічнага кантэксту.

Традыцыйны нацюрморт А. Мемуса не задавальняе, ён прагне больш сур'ёзнага дыялогу з натурай. Яго прыцягвае знакавая пабудова вобразнасці, разбурэння традыцыйнае прасторы, умоўнасці колеру.

Адзін з найбольш распаўсюджаных вобразаў-знакаў у акварэлях мастака – кветка. Кветкі ўвогуле ў мастака даволі часта паўстаюць як выразны сімвал хуткаплыннасці, недаўгавечнасці жыцця, незваротнасці часу, росквіту і заняпаду. Поўны біялагічны цыкл яе "жыцця" – ад нараджэння, праз квітнеючую прыгажосць сталасці, да завядання і смерці – перакладзены на мову знакавых метафар, складае канцэптуальна-філасофскі кантэкст твораў "Толькі імгненне" (1990), "Прысутнасць сухога нарцысу" (1994), "Прыходзім і адыходзім" (1999). У многіх вобразах гучыць непазбежны трагізм жыцця з уласцівымі яму іспытамі і пакутамі, кароткаімгненнымі хвілінамі гармоніі і шматлікімі момантамі расчараванняў.

Выявы сухіх кветак, якія даволі часта можна ўбачыць у кампазіцыях А. Мемуса, гэта своеасаблівае сцвярджэнне пазачасавага характару прыгажосці, яе нескаронасці і неўміручасці.

Вобраз засохлых кветак як своеасаблівае дакрананне да вечнасці… Разам з тым ружа ў карцінах А. Мемуса – гэта сімвал прыгажосці мімалётнага жыцця і разам з тым увасабленне шэрагу розных эмацыянальна-псіхалагічных станаў чалавечай натуры (цыкл кампазіцый “Саната руж”, Сухія ружы” (1988), “Чорная ружа” (1994), “Зьмярканне” (1995), “Вецер” (1996), “Накцюрн” (1996) , “Элегія”(1996)).

Шэраг твораў, якія ствараліся ў канцы 1980-х – 90-я гады пазней скlaліся ў знакавыя для творчасці мастака цыклы «Уздоўж берага» (1987–1992), «Сведкі» (1992–1995) і “Знак часу” (1995–1999). Алесь Мемус вольна вандруе праз культурныя слаі стагоддзяў (“Культурны слой (1996), “Знак культуры” (1998), “Цывілізацыя” (1996)). Калі ж датыкаецца да аскепкаў старасветчыны, заўважае нават дробныя рэчыўныя прыкметы таго ці іншага гістарычнага этапа (“Рэха мадэрну” (1994). Пры гэтым мастак адлюстроўвае не столькі саму рэч, колькі свае ўражанні ад яе, стварае ў кампазіцыях спецыфічнае “асяроддзе” для выяваў гэтых рэчаў, каб жыццё іх у гэтай віртуальнай прасторы магло доўжыцца вечна. Ці то гэта дэкаратыўная заколка X ст., якая зачаравала мастака дасканаласцю плеценага арнаменту (“Раскоша” (1997)), ці то старажытныя крэсівы (“Патрэба агню” – 1999 і “Попел” – 1999), фрагменты старажытнай віцебскай керамікі і кафлі (“Шкло і кафля” (1989)), шкла (“Сем бітых келіхаў” (1994), “Парфенон” (1999)) і драўлянай скульптуры (“Белы жаробка” (1995)).

Нярэдка ў кампазіцыях з цыклу “Знак часу” мастак адмаўляецца ад складаных канструкцый, прадстаўляе рэч франтальна, дае магчымасць панаглядаць за ўжо бачаным, пераасэнсаваць ўжо вядомае (“Пацір” (1997), “Крыж” (1997)). Падобныя творы становяцца своеасаблівым рытуалам, мэта якога, хутчэй за ўсё, засяродзіць увагу не на імгненнях жыцця рэчы, а на яе сутнаснай значнасці. Паганства і хрысціянства, якія гістарычна сталі рэальным грунтам у фарміраванні духоўнасці беларускага народа, удала суіснуюць у творах А. Мемуса. Многія каларыты ў яго акварэлях “сугучныя” з вядомым усім эфектам пацiны часу. Нярэдка ў творах Мемуса пры ўсёй складанасці каларыстычнага ладу і багацці нюансаў дамінуюць халодныя тоны, узмацняюць пачуццё драматызму, трывожнасці.

У экспазіцыі персанальнай выстаўкі акварэлі ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі (Мінск) у 1992 годзе гледачы ўбачылі вялікую акварэльную калекцыю, аснову якой склаў цыкл “Сведкі”. А ў 1999 г. у Віцебску ў Мастацкім музеі адбылася яшчэ адна персанальная выстава А. Мемуса “Урокі акварэлі”.

**Гуаш і алейны жывапіс.** Эксперыменты з гуашай у сярэдзіне 1980-х – пачатку 1990-х для А. Мемуса былі імкненнем да лаканічнасці ў трактоўцы формы і чысціні каларыстычнага рашэння (“Вечар у Шклове” (1986), “Сухія нарцысы ў белым збанку” (1994)). І разам з тым гуаш, як жывапіс, на наш погляд, мастак не ўспрымаў.

У канцы 1990-х – пачатку 2000-х мастак захоплены алейнай тэхнікай жывапісу. Піша алейны аўтапартрэт (1997), невялікія алейныя нацюрморты (“Сем каштанаў” (1997), “Пялёсткі ружы і мёртвая страказа” (1997), “Монадуэт” (2002), “Яблык” (2004)) і пейзажы (“Від з акна” (2000)), у якіх з вялікім натхненнем засвойвае гэту тэхніку, шукае ўласныя трансфармацыі формы і колеру.

У 2004 г. А. Мемус напісаў невялікую па памерах кампазіцыю “Двое”, на якой адлюстраваны два бітыя келіхі як сымбаль былое еднасці душ. А таксама задумаў цэлую серыю міні-кампазіцый з той жа назваю, але розных па вобразным строі, пластыцы, танальнасьці і каларыце. На працягу пяці гадоў мастак пісаў творы гэтай серыі. У 2010 годзе, калі не стала Ірыны Магучай, серыя налічвала 22 карціны. А. Мемус назваў гэту лічбу “ахоўна-недатыкальнай” і спыніў працу. Гэта серыя была прадстаўлена віцебскаму гледачу ў 2012 годзе і прысвечана музе творцы, яго каханай і спадарожніцы жыцця, той, што многія гады натхняла яго. Сярод алейных твораў неабходна прыгадаць і трыпціх “Наш Караткевіч”, напісаны ў 2000 г. і прадстаўлены на выставе, прысвечанай Ул. Караткевічу.

**Заключэнне.** У сваёй творчасці А. Мемус ніколі не прытрымліваўся ніякіх стылістычных і тэхнічных меж. Ад самага пачатку ў вобразнасці твораў мастака намеціліся асацыятыўнасць, схільнасць да разнастайных гістарычных алюзій і рэмінісцэнцый, зварот да айчыннай мастацкай культуры мінулых эпох. Творцу ўласцівыя эстэтычна вытанчаны густ і арыстакратызм творчага духу. Элітарны характар мастацтва А. Мемуса праяўляецца і ў спецыфічнай сістэме камунікатыўных сувязей, з’арыентаванай на пэўныя духоўныя арыенціры асобы гледача.

### ЛІТАРАТУРА

1. Лысенка, Л. Сляды сардэчных захапленняў / Л. Лысенка // Культура. – 2003. – 11–17 студз. – С. 7.
2. Погорелова, О. Уступны артыкул / О. Погорелова // Каталог выставки «Сто рисунков А. Мемуса». – Витебск, 1989. – С. 3.
3. Вакар, Л.У. Уступны артыкул / Л.У. Вакар // Каталог выставки “Алесь Мемус, акварэля”. – Витебск, 1993. – С. 34.
4. Базан, Л. Сто малюнкаў А. Мемуса / Л. Базан // Мастацтва Беларусі. – 2000. – № 9 – С. 78.
5. Пагранoўскі, М. Неабсяжны свет формаў і рытмаў... / М. Пагранoўскі // Мастацтва Беларусі. – 1990. – № 12. – С. 38–39.
6. Шунейка, Я. З мамінага акна / Я. Шунейка // Маладосць. – 1994. – № 2. – С. 96–97.
7. Пастернак, Т. «Уроки акварели» Алеся Мемуса / Т. Пастернак // Народнае слова. – 1999. – 20 лістап. – С. 5.

*Паступіў у рэдакцыю 29.08.2024*